Вітаю Вас, паважаныя калегі і чытачы бібліятэк Гомельскай вобласці. Сёння мы рады прадставіць вашай увазе вебінар на тэму «Фарміруем нашу будучыню: работа з падрастаючым пакаленнем». На жаль, абставіны склаліся так, што мы не можам сустрэцца адно з другім і абмеркаваць праблемы і пытанні, якія хвалююць сёння і бібліятэкараў, і чытачоў. Але, тым не менш, гэта не спыняе бібліятэкі. Яны ў розных жыццёвых абставінах шукаюць шлях да чытача, каб сеяць у грамадстве разумнае, добрае, вечнае. І сёння наш фармат семінара мае форму відэавыступленняў. Цяпер магчымасці лічбавай тэхнікі і інтэрнэту дазваляюць праводзіць мерапрыемствы рознага кшталту, у тым ліку і анлайн, але мы спыніліся менавіта на відэазапісах. Нам падалося, што магчымасць пазнаёміцца з матэрыяламі вебінару ў любым зручным месцы і зручных абставінах найбольш цікавая. А калі пройдзе час, іх можна перагледзець і зрабіць высновы, на колькі мы выраслі ў сваёй рабоце, а можа нават нешта важнае і ўспомніць. Бо, як вядома, ўсё новае – гэта добра забытае старое.

Мы вельмі ўдзячныя, што на прапанову да ўдзелу ў вебінары адгукнуліся бібліятэкі Масквы, Жодзіна (Мінская вобласць), Іванава (Брэсцкая вобласць), Гомельская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. І. Герцэна, а таксама нашыя раённыя бібліятэкі з Рагачова, Светлагорска, Рэчыцы, Жыткавіч, Жлобіна. Сваім вопытам у рабоце з маладымі чытачамі падзеляцца таксама аддзелы абслугоўвання вучняў 1–5 і 6–9 класаў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі імя У. І. Леніна.

І асабліва падзякаваць хочацца нашага госця – знакамітага беларускага мастака кнігі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі ў галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры Паўла Юр’евіча Татарнікава. Яго творчасцю захапляюцца не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Сведчаннем гэтаму служаць міжнародныя ўзнагароды. Ён

двойчы ўладальнік вышэйшай еўрапейскай узнагароды для кніжных ілюстратараў – прэміі «Залаты яблык» Брацiслаўскага біенале. Гэтая прэмія па значнасці роўная кінапрэміі Оскар у кінаіндустрыі.

Такім чынам, тэма нашага вебінара прысвечана рабоце з дзецьмі і прымеркавана да Міжнароднага дня абароны дзяцей. Можа прагучыць не вельмі крэатыўна, што «дзеці – нашае будучае», але гэта аксіёма нашага жыцця. Сёння – маленькія непаседы, цікаўныя гарэзы, а ў будучым – дактары, што стаяць на варце нашага здароўя і ратуюць жыцці людзей, дзеячы навукі, якія адкрываюць нязведаныя дагэтуль таямніцы гісторыі, фізікі, хіміі, касманаўты, мастакі, літаратары – усе, хто робяць нашае жыццё прыгожым, цікавым і надаюць яму сэнс. І ўвесь гэты вялікі і грунтоўны шлях пачынаецца з кнігі, якая выхоўвае, навучае, развівае.

Бібліятэкі ўсведамляюць у поўнай меры, на колькі важна закласці з самых юных гадоў любоў да чытання. Менавіта кніга дапаможа раскрыцца таленту, закладзенаму ад прыроды, вызначыць прыхільнасці да роду заняткаў, прафесіі, дбайна правесці вольны час. І каб скараціць шлях ад чытача да кнігі і дапамагчы ім пасябраваць,  ладзяць мноства розных імпрэзаў, акцый, гульняў, заняткаў. Часам здаецца, што фантазіі бібліятэкараў няма межаў дзеля таго, каб зацікавіць юных чытачоў. А яшчэ гэта і падказка для бацькоў, якія іншы раз не маюць магчымасці арганізаваць вольны час сваіх дзяцей. Дзверы бібліятэкі гасцінна расчынены для ўсіх.

Спадзяемся, што вопыт бібліятэк, прадстаўлены на вебінары, будзе цікавы і бібліятэкарам, і ўсім, хто працуе з дзецьмі. А калі ў каго з’явяцца пытанні, просім пакідаць іх ў выглядзе каментароў да відэавыступленняў. Прыемнага прагляду!